Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК і МЕНСКАГА АБКОМА КП(б)Б

№ 112 (6389) | 18 мая 1939 г., чацвер | ЦАНА 10 КАП.

АБ ВЫБАРАХ ПРОФОРГАНАЎ — ФАБРЫЧНА-ЗАВОДСКІХ І МЯСЦОВЫХ КАМІТЭТАЎ, АБЛАСНЫХ, КРАЯВЫХ І ЦЭНТРАЛЬНЫХ КАМІТЭТАЎ ПРОФСАЮЗАЎ

Пастанова VIII пленума ВЦСПС па дакладу тав. НІКАЛАЕВАЙ, прынятая 28 красавіка 1939 года

1. У сувязі са сканчэннем тэрмінаў поўнамоцтваў правесці справаздачы і выбары прафсаюзных органаў: фабрычна-заводскіх і мясцовых камітэтаў, а таксама абласных, краявых і Цэнтральных камітэтаў прафсаюзаў.

2. Справаздачы і выбары прафсаюзных органаў павінны быць праведзены пад знакам мабілізацыі шырокіх мас членаў прафсаюзаў на выкананне пастановы VIII пленума ВЦСПС «Аб рабоце прафсаюзаў у сувязі з рашэннямі XVIII з'езда ВКП(б)».

3. Абавязаць прафсаюзныя органы забяспечыць на справаздачна-выбарчых сходах, канферэнцыях і з'ездах прафсаюзаў разгортванне большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі, ускрыцце і знішчэнне недахопаў, якія ёсць у рабоце прафсаюзных органаў і іх кіраўнікоў, і вылучэнне ў састаў прафсаюзных органаў лепшых людзей рабочага класа і савецкай інтэлігенцыі, адданых справе партыі Леніна — Сталіна, здольных забяспечыць мабілізацыю шырокіх мас рабочых і служачых на барацьбу за выкананне гістарычных рашэнняў XVIII з'езда ВКП(б).

4. Справаздачы і выбары фабрычна-заводскіх, мясцовых і цэхавых камітэтаў і профгрупоргаў правесці ў маі — ліпені.

Даручыць Прэзідыуму ВЦСПС разам з ЦК прафсаюзаў устанавіць тэрміны правядзення справаздач і выбараў раённых, абласных, краявых і Цэнтральных камітэтаў прафсаюзаў.

5. Даручыць Прэзідыуму ВЦСПС разам з ЦК прафсаюзаў: рабочых геолагаразведчых работ, рабочых аўцагадоўчых соўгасаў, рабочых МТС, рабочых мяса-малочных соўгасаў Казахскай ССР і Сярэдняй Азіі і некаторымі іншымі ўстанавіць тэрміны справаздач і выбараў пізавых прафсаюзных органаў ў залежнасці ад асаблівасцей вытворчасці і сезоннасці работ.

6. Прапанаваць рэдакцыі газеты «Труд», фабрычна-заводскім шматтыражкам і ўсім органам прафсаюзнага друку шырока асвятляць справаздачы і выбары прафсаюзных органаў.

СТРОГА ЗАХОЎВАЦЬ КАЛГАСНЫ СТАТУТ

За годы свайго існавання калгасная вёска прайшла шлях гіганцкіх перамог. За годы другой пяцігодкі валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі нашай краіны павялічылася з 13 да 21,1 мільярда рублёў. Таварнасць калгаснай вытворчасці ў параўнанні з алнаасобнымі гаспадаркамі павялічылася больш чым у тры разы. На базе развіцця і ўмацавання аграмаджанай сацыялістычнай гаспадаркі расце заможнасць калгаснікаў. Толькі на працягу 1934—37 гг. валавы даход калгаснікаў павялічыўся больш чым у 2,7 раза, а грашовыя даходы, якія размяркоўваюцца паміж калгаснікамі на працадні,—у 4,5 раза. 1938 год прынёс калгаснай вёсцы новыя поспехі. Усе гэтыя перамогі заваёваны калгасным сялянствам пад мудрым кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, на аснове ажыццяўлення Статута сельгасарцелі. Таварыш Сталін вучыць нас таму, што «Статут — гэта вышэйшы закон, асноўны закон пабудовы новага грамадства ў вёсцы».

Іменна таму, што Статут адыгрывае рашаючую ролю ў жыцці калгасаў, ворагі народа, якія ў свой час арудвалі ў розных арганізацыях, сваю шкодніцкую дзейнасць у сельскай гаспадарцы ў першую чаргу накіроўвалі супроць Статута сельскагаспадарчай арцелі.

Ворагі народа, каб паслабіць сілу калгаснага ладу, прабавалі і прабуюць проціпаставіць асабістыя інтарэсы калгаснікаў грамадскім інтарэсам калгасаў, адраджаць і культывіраваць дробнабуржуазныя перажыткі калгаснікаў, заахвочваць разбазарванне сацыялістычнай уласнасці, штурхаць калгаснікаў на непамернае павелічэнне асабістай гаспадаркі. На XVIII з'ездзе нашай партыі тав. Молатаў гаварыў: «Не без уплыву чуждых і прама шкодніцкіх элементаў інтарэсы падсобнай гаспадаркі калгаснікаў у некаторых выпадках сталі проціпастаўляць інтарэсам калгаса. Між тым, у сялян ёсць толькі адзін верны шлях да далейшага палепшання свайго жыцця — большэвіцкі шлях **умацавання калгасаў**».

Барацьба за поўнае і паўсяменнае выкананне Статута сельскагаспадарчай арцелі, барацьба за правільнае спалучэнне асабістых інтарэсаў калгаснікаў з грамадскімі інтарэсамі калгасаў — ёсць барацьба за далейшы росквіт калгаснай вёскі, за рост заможнасці калгаснікаў.

Нямала фактаў парушэння Статута сельскагаспадарчай арцелі было адзначана ў многіх раёнах нашай рэспублікі ў мінулым годзе. Гэтыя парушэнні выразіліся ў бяспорным павелічэнні прысядзібных участкаў і жывёлы ў асабістым карыстанні калгаснікаў, у разбазарванні калгаснай зямлі. Пад кіраўніцтвам і пры самай дзейснай дапамозе ЦК ВКП(б), саюзнага ўрада і асабіста таварыша Сталіна большэвікі Беларусі правялі вялікую работу па выпраўленню дапушчаных скажэнняў Статута сельскагаспадарчай арцелі. Мерапрыемствы па выпраўленню скажэнняў былі поўнасцю адобраны асноўнай масай калгаснікаў.

Аднак, як паказваюць факты, у некаторых раёнах рэспублікі і па гэты час далёка не ліквідаваны парушэнні Статута сельскагаспадарчай арцелі. Кіраўнікі асобных партыйных і савецкіх арганізацый, некаторыя зямельныя работнікі праяўляюць бясклопатныя, ліберальныя адносіны да парушальнікаў Статута сельскагаспадарчай арцелі.

Вось некаторыя факты. Калгас імені Молатава, Рэчыцкага раёна, у 1938 годзе здаў у арэнду заводу «Інтэрнацыянал» 40 гектараў сенажаці. Гэты дагавор яшчэ не скасован і зараз. Калгас «Чырвоны Днепр» здаў у арэнду аднаасобнікам 12,5 гектара сенажаці.

Старшыня калгаса «Чырвоная Міслоціна» Д. Мішур раздаў 10 гектараў калгаснай зямлі розным арганізацыям і грамадзянам мястэчка Глуск. Старшыня калгаса «Рассвет», Глускага раёна, т. Муха зусім нядаўна вызначыў два гектары зямлі для работнікаў райвыканкома. Старшыня калгаса «Чырвоная Беларусь», таго-ж раёна, т. Баярка вясной гэтага года ўзяў для сябе прысядзібнай зямлі больш чым прадугледжана статутам. У раёне нямала фактаў захвату калгаснай зямлі некаторымі аднаасобнікамі.

У некаторых калгасах Мазырскага раёна незаконнае расшырэнне прысядзібных участкаў калгаснікамі робіцца пад повадам палзелу гаспадарак.

Ёсць факты, калі ініцыятарамі празмерных прысядзібных участкаў з'яўляюцца самі старшыні калгасаў. Вось, напрыклад, старшыня калгаса «Чырвоны ўсход», Даманавіцкага раёна, І. Еўдаш. Ён захапіў прысядзібны ўчастак у памеры паўтара гектара. Такія-ж сядзібы маюць яшчэ тры калгаснікі гэтага калгаса. Прэтэсты калгаснікаў супроць парушэння статута Еўдашовым ні да чаго не прывялі.

Можна было-б прывесці многа іншых фактаў з калгасаў Палескай і Гомельскай абласцей. Ёсць падобныя факты і ў некаторых іншых абласцях і раёнах рэспублікі. Усе гэтыя факты разбазарвання калгаснай зямлі, бяспамернага расшырэння прысядзібных участкаў паказваюць на праяўленне буржуазных тэндэнцый у асобных калгасах. Гэтыя тэндэнцыі заносяцца ў калгасы варожымі элементамі або малаўстойлівымі, яшчэ нявыхаванымі ў духу калгаснага ладу асобнымі калгаснікамі.

Відаць, што кіраўнікі Даманавіцкага, Мазырскага, Глускага і некаторых іншых раёнаў, дзе прыміранча адносяцца да фактаў нарушэння статута, і па гэты час не зразумелі сутнасці ўказанняў таварыша Сталіна аб правільным спалучэнні асабістых інтарэсаў калгаснікаў з грамадскімі інтарэсамі калгасаў, аб сіле і значэнні калгаснага статута. Не відаць таксама, каб Палескі абласны зямельны аддзел змагаўся па-большэвіцку за ажыццяўленне Статута сельгасарцелі. Незразумела, чаму церпіць гэтыя буйнейшыя скажэнні статута Палескі абком КП(б)Б.

Парушэнні Статута сельскагаспадарчай арцелі павінны быць выпраўлены хутка і рашуча. Трэба арганізаваць праверку выканання статута ў кожным калгасе. Раз'ясніць калгаснікам, што **калгас, арцельная гаспадарка — гэта асноўная крыніца росту заможнасці калгаса, калгаснікаў**, што асабістая гаспадарка калгаснікаў павінна насіць **падсобны** характар. Трэба раз'ясніць калгаснікам, што той, хто разбазарвае калгасную зямлю, хто падрывае калгасную працоўную дысцыпліну, хто распальвае адсталыя настроі і заахвочвае калгаснікаў на незаконнае расшырэнне прысядзібных участкаў, — той робіць справу ворага, той наносіць вялікую шкоду інтарэсам калгаснікаў.

XVIII з'езд ВКП(б) паставіў велізарныя задачы перад сельскай гаспадаркай. Як і ва ўсёй краіне, у калгаснай вёсцы шырыцца сацыялістычнае спаборніцтва імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі. Выкананне намечанай XVIII з'ездам ВКП(б) праграмы па далейшаму ўздыму сельскай гаспадаркі патрабуе строгага захавання Статута сельскагаспадарчай арцелі.

Узмацнім барацьбу з парушэннямі Статута сельскагаспадарчай арцелі!

Партыйныя і савецкія арганізацыі, зямельныя органы рэспублікі павінны выхоўваць калгаснікаў у духу няўхільнага ажыццяўлення сталінскага Статута сельскагаспадарчай арцелі.

ІНСТРУКЦЫЯ АБ АРГАНІЗАЦЫІ І ПРАВЯДЗЕННІ ВЫБАРАЎ ПРОФСАЮЗНЫХ ОРГАНАЎ

ЗАЦВЕРДЖАНА VIII ПЛЕНУМАМ ВЦСПС 28 КРАСАВІКА 1939 г.

1. Пры правядзенні выбараў прафсаюзных органаў неабходна строга кіравацца наступным рашэннем VI пленума ВЦСПС:

«Забараніць пры выбарах профорганаў галасаванне спіскам, галасаванне праводзіць па асобных кандыдатурах, забяспечыўшы пры гэтым за ўсімі членамі прафсаюзаў неабмежаванае права адводу кандыдатаў і крытыкі апошніх. Устанавіць пры выбарах профорганаў закрытае (тайнае) галасаванне кандыдатаў».

2. Закрытым (тайным) галасаваннем выбіраюцца:

а) фабрычна-заводскія і мясцовыя камітэты, цэхавыя камітэты, арганізатары прафсаюзных груп (профгрупоргі);

б) дэлегаты на раённыя, гарадскія, абласныя, краявыя і рэспубліканскія канферэнцыі і на з'езды прафсаюзаў;

в) раённыя, гарадскія, абласныя, краявыя, рэспубліканскія і цэнтральныя камітэты прафсаюзаў;

г) рэвізійныя камісіі прафсаюзных органаў.

3. Адкрытым галасаваннем выбіраюцца на пленумах адпаведных камітэтаў:

а) старшыні і намеснікі старшынь фабрычна-заводскіх і мясцовых камітэтаў і старшыні цэхавых камітэтаў;

б) старшыні і сакратары раённых, гарадскіх, абласных, краявых, рэспубліканскіх і Цэнтральных камітэтаў прафесіянальных саюзаў;

в) прэзідыумы раённых, гарадскіх, абласных, краявых, рэспубліканскіх і Цэнтральных камітэтаў прафесіянальных саюзаў;

г) старшыні рэвізійных камісій — на пасяджэннях рэвізійных камісій.

4. Выбары прафсаюзных органаў на прадпрыемствах, ва ўстановах, навучальных установах праводзяцца ў наступным парадку: спачатку выбіраюцца фабрычна-заводскія і мясцовыя камітэты, рэвізійныя камісіі, затым цэхавыя камітэты і профгрупоргі.

5. Уся падрыхтоўчая работа па правядзенню справаздачна-выбарчых сходаў на прадпрыемствах, ва ўстановах і навучальных установах усклада́ецца на фабрычна-заводскія і мясцовыя камітэты.

Фабрычна-заводскія і мясцовыя камітэты не пазней чым за 10 дзён да справаздачна-выбарчага сходу паведамляюць членаў прафсаюза аб плане правядзення справаздачна-выбарчага сходу.

Справаздачна-выбарчы сход адкрываецца прадстаўніком адпаведнага прафсаюзнага органа, г. зн. агульны сход членаў прафсаюза прадпрыемства або ўстановы адкрываецца прадстаўніком фабрычна-заводскага або мясцовага камітэта, сход членаў прафсаюза цэха — прадстаўніком цэхавага камітэта, сход прафсаюзнай групы — профгрупоргам.

Для вядзення справаздачна-выбарчага сходу выбіраецца адкрытым галасаваннем прэзідыум. Колькасць членаў прэзідыума ўстанаўліваецца самім сходам. Кандыдатуры ў састаў прэзідыума высоўваюцца непасрэдна на самім сходзе.

Членам прафсаюза, жадаючым выставіць кандыдатуры ў састаў прэзідыума, прадстаўнік адпаведнага прафсаюзнага органа, адкрываючы сход, прадастаўляе слова для ўнясення прапановы аб персанальным саставе прэзідыума.

6. Справаздачы і выбары фабрычна-заводскіх і мясцовых камітэтаў праводзяцца на агульных сходах членаў прафсаюзаў прадпрыемстваў, устаноў, навучальных устаноў. Справаздачы і выбары забараняецца праводзіць на канферэнцыях агульназаводскіх і ўстаноў.

У тых выпадках, калі па ўмовах вытворчасці (бесперапыннасць вытворчасці, многазменнасць) немагчыма склікаць агульны сход членаў прафсаюза, дапускаецца з дазволу ў кожным асобным выпадку адпаведнага цэнтральнага камітэта прафсаюза праводзіць справаздачы і выбары фабрычна-заводскага камітэта на зменных або цэхавых сходах.

Пасля абмеркавання справаздачы фабрычна-заводскага камітэта і прыняцця рашэння па справаздачы на цэхавых або зменных сходах выбіраюцца адкрытым галасаваннем даверaныя асобы па норме — адзін даверaны ад 25—50 членаў прафсаюза.

Нарада даверaных высоўвае і абмяркоўвае кандыдатуры ў састаў фабрычна-заводскага камітэта і рэкамендуе кожнага паасобку кандыдата цэхаваму або зменнаму сходу. Нарада даверaных склікаецца фабрычна-заводскім камітэтам. Пасля абмеркавання кандыдатаў на цэхавых або зменных сходах фабрычна-заводскі камітэт складае спісак кандыдатаў для закрытага (тайнага) галасавання.

7. Справаздачы і выбары цэхавых камітэтаў праводзяцца на сходах членаў прафсаюза цэха. У тых выпадках, калі па ўмовах вытворчасці немагчыма склікаць сход членаў прафсаюза цэха, дапускаецца з дазволу фабрычна-заводскага і мясцовага камітэта склікание сходаў членаў прафсаюза па зменах.

8. Справаздачы і выбары профгрупоргаў праводзяцца на сходах профгруп.

9. Справаздачна-выбарчыя сходы членаў прафсаюза лічацца правамоцнымі ў тым выпадку, калі на іх прысутнічае не менш ²/₃ спісачнага састава членаў прафсаюза, працуючых на прадпрыемстве, ва ўстанове ў перыяд выбараў.

10. Выбары прафсаюзных органаў і рэвізійных камісій праводзяцца пасля заслухання і абмеркавання справаздачных дакладаў і прыняцця рашэнняў па іх.

11. Па сканчэнні абмеркавання справаздачы фабрычна-заводскага і мясцовага камітэта, цэхавага камітэта, раённага, абласнога, краявога, рэспубліканскага, Цэнтральнага камітэтаў прафсаюзаў і прыняцця рашэнняў па справаздачы, агульны сход, канферэнцыя або з'езд устанаўлівае колькасць членаў новага састава адпаведнага камітэта саюза, рэвізійнай камісіі, кіруючыся ў адносінах фабрычна-заводскіх, мясцовых, раённых, абласных, краявых і рэспубліканскіх камітэтаў дырэктывай ЦК саюза, а ў адносінах ЦК саюза дырэктывай ВЦСПС.

12. Кандыдатуры ў новы састаў прафсаюзнага органа высоўваюцца на сходзе членаў прафсаюза, канферэнцыі, з'езде.

Кожнаму члену прафсаюза, які жадае выставіць тую ці іншую кандыдатуру ў састаў прафсаюзнага органа, прэзідыум сходу прадастаўляе слова для ўнясення прапановы аб кандыдатуры і для абгрунтавання гэтай прапановы.

У выпадку паступлення прапановы аб спыненні выстаўлення кандыдатур у адпаведны прафсаюзны орган прэзідыум сходу ставіць гэтую прапанову на рашэнне агульнага сходу, канферэнцыі або з'езда і адкрытым галасаваннем вырашаецца пытанне прадаўжаць ці спыніць запіс новых кандыдатур у састаў выбіраемага прафсаюзнага органа.

Абмеркаванне кандыдатур праводзіцца персанальна. Пры персанальным абмеркаванні кандыдатур павінна быць забяспечана неабмежаванае права адводу высунутых кандыдатур у састаў прафсаюзнага органа, г. зн. кожны ўдзельнік сходу можа адводзіць любую колькасць высунутых кандыдатур, і па кожнай высунутай кандыдатуры можа выказацца неабмежаваная колькасць членаў прафсаюза як «за», так і «супроць».

У выпадку паступлення прапаноў аб спыненні абмеркавання той ці іншай кандыдатуры прэзідыум ставіць гэтую прапанову на вырашэнне агульнага сходу, канферэнцыі, з'езда і адкрытым галасаваннем вырашаецца пытанне аб спыненні або прадаўжэнні абмеркавання данай кандыдатуры.

13. Пасля абмеркавання кандыдатур, супроць якіх паступілі адводы, неабходна ў кожным асобным выпадку ў парадку адкрытага галасавання вырашаць пытанне аб уключэнні або неўключэнні данай кандыдатуры ў спісак, складаемы для правядзення выбараў у прафсаюзны орган закрытым (тайным) галасаваннем. Пры гэтым неабходна падлічыць усе галасы як «за адвод», так і «супроць адводу».

У адносінах-жа тых кандыдатур, супроць якіх адводаў не паступіла, адкрытае галасаванне не праводзіцца, і гэтыя кандыдатуры ўключаюцца ў спісак для закрытага (тайнага) галасавання.

За правільнасць спісаў, прадстаўляемых да закрытага (тайнага) галасавання пасля абмеркавання кандыдатур на сходзе, канферэнцыі, з'ездзе, адказвае прэзідыум сходу, канферэнцыі, з'езда. Прэзідыум абавязан старанна праверыць правільнасць запісаў у складзеным спіску.

Спіскі для закрытага (тайнага) галасавання не павінны падпісвацца галасуючымі.

14. Перад правядзеннем закрытага (тайнага) галасавання агульны сход членаў прафсаюза, канферэнцыя, з'езд выбірае адкрытым галасаваннем шчотную камісію для падліку рэзультатаў закрытага (тайнага) галасавання.

Колькасць членаў шчотнай камісіі ўстанаўліваецца агульным сходам, канферэнцыяй, з'ездам. Члены шчотнай камісіі выбіраюць старшыню шчотнай камісіі.

На прадпрыемствах і ва ўстановах, дзе выбары фабрычна-заводскіх і мясцовых камітэтаў праводзяцца на цэхавых і зменных сходах, агульназаводская шчотная камісія складаецца з прадстаўнікоў, выбраных у шчотную камісію на цэхавых, зменных сходах членаў прафсаюза. У гэтых выпадках агульная колькасць членаў шчотнай камісіі і колькасць прадстаўнікоў у гэтую камісію ад кожнага цэха або змены ўстанаўліваецца фабрычна-заводскім або мясцовым камітэтам.

Перад галасаваннем старшыня шчотнай камісіі (а на тых прадпрыемствах, дзе выбары праводзяцца на цэхавых—зменных сходах, — член шчотнай камісіі) абавязан раз'ясніць сходу членаў прафсаюза, дэлегатам канферэнцыі, з'езда парадак правядзення закрытага (тайнага) галасавання.

Шчотная камісія перад закрытым (тайным) галасаваннем абавязана падрыхтаваць выбарчыя скрынкі і асабіста іх апячатаць або замкнуць.

15. Шчотная камісія выдае кожнаму ўдзельніку выбарчага сходу, канферэнцыі, з'езда па прад'яўленні ім прафсаюзнага білета або дэлегацкага мандата па аднаму экземпляру спісаў кандыдатур, намечаных у новы састаў прафсаюзных органаў, і адзначае ў спісках удзельнікаў сходу, канферэнцыі, з'езда або на мандатах аб тым, што член прафсаюза, дэлегат прымаў удзел у галасаванні.

16. У закрытым (тайным) галасаванні прымаюць удзел толькі члены прафсаюза.

Кожны член прафсаюза пры закрытым (тайным) галасаванні мае права закрэсліваць асобныя кандыдатуры і дабаўляць новыя кандыдатуры ў састаў прафсаюзных органаў, незалежна ад таго, у якой колькасці ўстанавіў сход, канферэнцыя, з'езд выбраць новы састаў прафсаюзнага органа.

17. Пасля галасавання шчотная камісія ўскрывае выбарчыя скрынкі і праводзіць у адведзеным для гэтай мэты памяшканні падлік рэзультатаў галасавання.

Шчотная камісія абавязана падлічваць усе галасы «за» і «супроць» кожнай кандыдатуры паасобку.

Пасля падліку галасоў шчотная камісія складае пратакол, у які заносіць рэзультаты галасавання па кожнай кандыдатуры паасобку, і ўсе члены камісіі падпісваюць гэты пратакол.

У памяшканні, дзе праводзіцца падлік, ніхто не мае права знаходзіцца, апрача членаў шчотнай камісіі.

18. Шчотная камісія на выбарчым сходзе, канферэнцыі, з'ездзе дакладвае рэзультаты галасавання па кожнай кандыдатуры паасобку.

Выбранымі ў састаў прафсаюзнага органа лічацца атрымаўшыя большасць галасоў, але не менш палавіны галасоў членаў саюза, дэлегатаў канферэнцыі, з'езда, якія прысутнічаюць на сходзе, канферэнцыі, з'ездзе.

19. Увесь матэрыял закрытага (тайнага) галасавання (спіскі кандыдатур, пісьмовыя заявы, падлікі галасавання і т. п.) павінен захоўвацца на правах сакрэтных дакументаў у адпаведных прафсаюзных органах.

ВЫБАРЧЫЯ БЮЛЕТЭНІ ЗАХОЎВАЮЦЦА:

а) па выбарах профгрупоргаў, цэхкомаў, фабрычна-заводскіх і мясцовых камітэтаў — на працягу 3-х месяцаў;

б) па выбарах абкомаў, крайкомаў, рэспубліканскіх камітэтаў — на працягу 4-х месяцаў;

в) па сканчэнні ўказаных тэрмінаў выбарчыя бюлетэні павінны знішчацца, аб чым складаецца акт у 3-х экземплярах за подпісам члена адпаведнага прафсаюзнага органа і рэвізійнай камісіі; акты павінны захоўвацца ў адпаведных прафсаюзных органах на правах сакрэтных дакументаў.

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ НАРАДА РАБОТНІКАЎ СУДА І ПРАКУРАТУРЫ

Учора ў вялікім зале Дома партактыва адкрылася рэспубліканская нарада работнікаў суда і пракуратуры. На нарадзе прысутнічае 186 народных суддзяў, пракураораў, членаў Вярхоўнага і абласных судоў.

Нараду адкрыў старшыня СНК БССР тав. Кісялёў. Ва ўступнай прамове тав. Кісялёў ахарактарызаваў асноўныя задачы работнікаў суда і пракуратуры ў барацьбе за рэвалюцыйную законнасць, за ажыццяўленне Сталінскай Канстытуцыі, за абарону законных праў грамадзян краіны сацыялізма. Пры ўпамінанні імені вялікага Сталіна ўдзельнікі нарады наладжваюць працяглую авацыю.

Даклад аб становішчы работы судовых органаў БССР зрабіў нарком юстыцыі тав. Лодысеў.

Падкрэсліўшы ролю савецкага суда ў справе ўмацавання сацыялістычнай дзяржавы, дакладчык гаворыць, што хаця ў рабоце суда дасягнута паляпшэнне, аднак ёсць яшчэ і рад недахопаў.

На канкрэтных прыкладах тав. Лодысеў паказвае, як асобныя народныя суды няправільна вырашаюць справы, задягваюць разгляд іх, ствараюць валакіту, сістаматычна не робяць справаздач перад працоўнымі.

Тав. Лодысеў прызнае, што Наркамюст не стаў яшчэ баявым штабам кіраўніцтва судовымі органамі, што ў яго рабоце яшчэ не выжыта папяровае кіраўніцтва.

У спрэчках па дакладу выступілі тт. Вараб'ёў (Бабруйск, нарсуд 6-га ўчастка), Кегелес (Віцебскі абл. аддз. юстыцыі), Аграновіч (нарсуд, Быхаў), Кірэеў (Магілеўская аблпракуратура), Новік (пракурор БССР) і інш.

У рабоце рэспубліканскай нарады прымаюць удзел сакратары ЦК КП(б)Б тт. Кальноў і Грэкава, нарком унутраных спраў тав. Цанава, член калегіі Наркамата юстыцыі СССР тав. Ташэў і прадстаўнікі пракуратуры СССР тт. Ульянава і Асіпенка.

Сёння нарада прадаўжае сваю работу.

СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА ІМЕНІ ТРЭЦЯЙ СТАЛІНСКАЙ ПЯЦІГОДКІ

* * *

НА ВАХТУ ІМЕНІ ТРЭЦЯЙ СЕСІІ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

Шырока разгарнуўшы сацыялістычнае спаборніцтва імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі, менская швейная фабрыка «Кастрычнік» дабілася значных вытворчых поспехаў. Чатырохмесячны план выканан на 103,5 проц. Звыш плана выпушчана прадукцыі на 394 тыс. рублёў. Перавыкананы план росту прадукцыйнасці працы. Фабрыка мае эканоміі па сабекошту на 347 тыс. рублёў.

Учора на фабрыцы адбыўся мітынг, прысвечаны падрыхтоўцы да Трэцяй Сесіі Вярхоўнага Совета СССР, на якім прысутнічала 1.200 чалавек.

Выступіўшы на мітынгу майстар тав. Патэнт гаварыў аб сіле сацыялістычнага спаборніцтва, аб савецкім патрыятызме, аб гарачых пачуццях любві да вялікага і мудрага Сталіна — першага дэпутата народа ў Вярхоўны Совет СССР.

— Рабочы калектыў, — заявіў т. Патэнт,—гарыць жаданнем сустрэць Трэцюю сесію сацыялістычнага парламента нашай краіны новымі поспехамі, новымі вытворчымі перамогамі.

У аднадушна прынятай рэзалюцыі рабочы калектыў фабрыкі абавязаўся стаць на сталінскую вахту імені трэцяй сесіі Вярхоўнага Совета СССР і закончыць пяцімесячную вытворчую праграму 20 мая, а да дня адкрыцця сесіі даць прадукцыі звыш плана на 500 тысяч рублёў.

ВЫКАНАЛІ ПОЎГАДОВЫ ПЛАН

Разгортваючы сацыялістычнае спаборніцтва імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі, калектыў рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых Магілеўскага сушыльнага камбіната ўзяў абавязацельства выканаць поўгадовы план да 1 чэрвеня. Сваё абавязацельства рабочыя выканалі датэрмінова. 16 мая закончана шасцімесячная праграма на 105,5 проц. Выпушчана прадукцыі на 1.596 тысяч рублёў. Калектыў камбіната абавязаўся да канца першага паўгоддзя даць краіне далатковa прадукцыі на 450 тысяч рублёў.

Л. Д. ВАЛОДЗІН.

* * *

Калектыў менскай лесахімічнай арцелі «Уперад» з чэсцю выконвае свае абавязацельствы, узятыя ў сацыялістычным спаборніцтве імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі. 15 мая арцель выканала сваю поўгадовую праграму на 104,8 проц., выпусціўшы на 1.303.800 рублёў прадукцыі. Лепшыя стаханаўцы арцелі тт. Кандрашкова, Вашкевіч, Ляўкоў, Кантар выконваюць свае нормы выпрацоўкі на 170—300 процантаў.

ГУРЭВІЧ, АКСЕЛЬРОД.

* * *

ВЫДАТНЫЯ ПАКАЗАЛЬНІКІ

ОРША, 17 мая. (БЕЛТА). Недыходзячую Сесію Вярхоўнага Совета СССР ткацкая фабрыка Аршанскага ільнакамбіната сустракае выдатнымі поспехамі ў рабоце. 17 мая фабрыка выканала пяцімесячную праграму. Выпушчана 1.542 тысячы метраў тканіны. Перадавыя брыгады тт. Пунчанка і Раманоўскага выпусцілі звыш пяцімесячнага плана 26 тысяч метраў тканіны.

Выдатна працуюць васьмістаночніцы тт. Глушанкова, Варанецкая, Кунцэвіч, Лугаўцова і інш.

Калектыў ткацкай фабрыкі абавязаўся да канца месяца выпусціць звыш плана 200 тысяч метраў тканіны.

СТАХАНАЎСКАЯ ПРАЦА

АСІПОВІЧЫ, 17 мая. (БЕЛТА). Многія брыгады торфзавода «Татарка» з кожным днём павялічваюць сваю выпрацоўку, дабіваюцца новых поспехаў.

На балоце працуе 7 машын па здабычы торфу. Іх абслугоўвае 14 брыгад, якія спаборнічаюць паміж сабой. На скрэперных машынах лепшыя ўзоры паказвае брыгада тав. Шайкоўскага Паўла. 15 мая яна выпусціла 42·100 цаглін пры норме 38.000. Брыгада тав. Брокера ў гэты дзень дала 41.400 цаглін, а 16 мая — 46.800 штук. Перавыконвае таксама сваё дзённае заданне брыгада тав. Пятрушэні.

Добрыя прыклады паказваюць працуючыя на элеватарных машынах брыгады тт. Касцюкевіча, Шэндрыка, Дзянісевіча, Гуліка і Тарабуева. 15 мая брыгада тав. Касцюкевіча дала 147 проц. дзённага задання, а 16 мая — 200 проц.

Калектыў завода змагаецца за выкананне месячнага плана здабычы торфу да дня адкрыцця Трэцяй Сесіі Вярхоўнага Совета СССР.

ПІОНЕРСКАЯ МАЁЎКА Ў ДРАЗДАХ

НА МАЁЎЦЫ ПРЫСУТНІЧАЎ САКРАТАР ЦК КП(б)Б ТАВ. ПАНАМАРЭНКА.

17 мая ў дачнай мясцовасці Дразках адбылася маёўка 11 піонерскага атрада 4 менскай сталінскай школы імені Кірава, прысвечаная 15-годдзю з дня прысваення піонерскай арганізацыі імені В. І. Леніна. Рэбяты заслухалі гутарку аб 15-годдзі і справаздачу аб сацыялістычным спаборніцтве ў 4 чверці вучэбнага года. Яны ўзялі абавязацельства добра здаць іспыты.

На маёўцы прысутнічаў сакратар ЦК КП(б)Б тав. Панамарэнка, які ў гутарцы заклікаў рэбят добра здаць іспыты і спыніўся на задачах абаронай работы ў школах і асабліва сярод дзяцей у летні перыяд. Ён расказаў дзецям аб подвігах нашых герояў і заклікаў усіх піонераў быць палкімі патрыётамі сацыялістычнай радзімы.

На маёўцы быў арганізован добры каскёр. Рэбяты прагледзелі фільм «Кармелюк».

Н. ВАРАНЕЦКІ.

У АПОШНЮЮ МІНУТУ

РАТЫФІКАЦЫЯ СОВЕЦКА-ПОЛЬСКАГА ГАНДЛЁВАГА ДАГАВОРУ ПОЛЬСКІМ СЕЙМАМ

ВАРШАВА, 17 мая. (ТАСС). На ўчарашнім пленарным пасяджэнні польскага сейма абмяркоўваўся законапраект аб ратыфікацыі гандлёвага дагавору паміж Польшчай і СССР, падпісанага ў лютым гэтага года. Дакладчык дэпутат Шчыт-Неміровіч падкрэсліў, што гэты дагавор з'яўляецца першым пагадненнем, якое рэгулюе на моцнай аснове гандлёвы абарот паміж абодвума краінамі. Гэты дагавор мае палітычнае значэнне, паколькі да гэтага часу Польшча не мела падобнага дагавору з Совецкім Саюзам.

Шчыт-Неміровіч таксама адзначыў, што падпісаны дагавор прадугледжвае ўвоз у Польшчу совецкай сыравіны (марганцавай руды, бавоўны, фасфарытаў), што пры цяперашнім еўрапейскім становішчы набывае асабліва важнае значэнне.

Закон аб ратыфікацыі польска-совецкага дагавору прынят сеймам у другім і трэцім чытанні.

У дапамогу прапагандысту

НЕПЕРАМОЖНАЯ ЗБРОЯ КОМУНІЗМА

ДА 35-ГОДДЗЯ КНІГІ ЛЕНІНА „КРОК УПЕРАД, ДВА КРОКІ НАЗАД“

19 мая спаўняецца трыццаць пяць год з дня выхаду ў свет кнігі Леніна «Крок уперад, два крокі назад». Гэта кніга адыграла выключна вялікую ролю ў жыцці партыі, у яе барацьбе з ворагамі рабочага класа, у барацьбе за дыктатуру пролетарыята, за соцыялізм. У гэтай кнізе Ленін адстаяў неабходнасць партыі новага тыпу, разграміў апартунізм меншавікоў у арганізацыйных пытаннях, стварыў упершыню ў гісторыі марксізма навуку аб партыі, як перадавым, арганізаваным і дысцыплінаваным атрадзе рабочага класа, без кіраўніцтва якога рабочы клас не зможа дабіцца перамогі над буржуазіяй, ператварыць сябе з прыгнечанага ў пануючы клас, знішчыць дзяленне грамадства на класы, знішчыць усе і ўсякія прычыны, параджаючыя класавы гнёт і эксплаатацыю.

Кніга Леніна «Крок уперад, два крокі назад» з'яўляецца найвялікшым укладам у скарбніцу марксізма. Яе значэнне не вычэрпваецца рамкамі нашай краіны. Яна набыла міжнароднае значэнне, стала фундаментам арганізацыі комуністычных партый у капіталістычных краінах. Яна з'яўляецца незамянімай зброяй у барацьбе за дыктатуру пролетарыята, за соцыялізм. Яна распаўсюджвалася і распаўсюджваецца не толькі на мовах народаў СССР, але і на мовах народаў усяго свету. Гэта кніга — інтэрнацыянальна, як інтэрнацыянален сам ленінізм.

ВКП(б) расла і мацнела ў барацьбе са сваімі ворагамі і перамагла таму, што яна кіравалася вучэннем Леніна—Сталіна аб партыі. Усе дробнабуржуазныя палітычныя плыні ў рабочым класе і ўнутры партыі з'яўляліся ворагамі партыі Леніна—Сталіна, ворагамі ленінска-сталінскай партыйнасці. Яны ўсе без выключэння змагаліся супроць рэволюцыйнай партыі пролетарыята, супроць яе арганізацыйных прынцыпаў, супроць яе рэволюцыйнай тэорыі, супроць яе стратэгічнага і тактычнага кіраўніцтва.

Але партыя Леніна — Сталіна не здала ні адной сваёй пазіцыі капітулянтам, малаверам, агентам буржуазіі ў рабочым класе. Яна вяла з імі бязлітасную барацьбу, пераадольвала ў баях іх супраціўленне, ператвараючыся ў непераможную сілу. Многа было ахвотнікаў падмяць, прынізіць, ліквідаваць партыю большэвікоў. Але ўсе іх спробы ўсякі раз разбіваліся аб адзінства радоў большэвіцкай партыі, якая будавалася і мацнела на гранітнай аснове рэволюцыйнага вучэння марксізма-ленінізма.

Партыя большэвікоў правяла народы нашай краіны праз агонь трох рэволюцый, знішчыла ўладу памешчыкаў і капіталістаў, пабудавала першую ў свеце соцыялістычную дзяржаву рабочых і сялян. Ворагі-ж партыі ўсіх масцей і напрамкаў апынуліся ў ходзе барацьбы з большэвікамі ў лагеры фашызма, у лагеры злейшых ворагаў совецкага народа. Такі бясслаўны лёс эсэраў, меншавікоў, анархістаў, трацкістаў, бухарынцаў, буржуазных нацыяналістаў.

«Прайшоўшыя годы былі годамі беспрэцэдэнтнага ўзбраення партыі, адточвання яе арганізацыйнай зброі. Калі Ленін у сваёй выдатнай рабоце «Крок уперад, два крокі назад» развіў арганізацыйныя палажэнні, стаўшыя затым арганізацыйнымі асновамі партыі новага тыпу, партыі большэвікоў, то таварыш Сталін як у галіне тэорыі, ідэалогіі і тактыкі, так і ў пытаннях пастаноўкі ўсёй нашай арганізацыйнай работы на навуковыя рэльсы развіў далей асновы арганізацыйнага вучэння аб партыі, даныя Леніным, папоўніў арганізацыйнае вучэнне аб партыі новымі палажэннямі, новымі законамі, рушыў арганізацыйную навуку большэвізма ўперад і тым самым узброіў партыю і рабочы клас на ажыццяўленне сусветна-гістарычных задач пабудовы соцыялізма ў нашай краіне». (З даклада таварыша Жданава на XVIII з'ездзе ВКП(б).

***

Другі з'езд партыі адыграў велізарную гістарычную ролю ў развіцці рэволюцыйнага руху ў Расіі.

На з'ездзе была атрымана перамога марксізма над «эканамізмам», над апартунізмам, на з'ездзе была прынята праграма і статут партыі. Але другі з'езд партыі ў той-жа час паказаў наяўнасць у партыі двух палітычных груп, варожых адна другой, наяўнасць у партыі апартуністычнай меншавіцкай плыні, не прызнаючай рэволюцыйных і арганізацыйных прынцыпаў, выпрацаваных газетай «Искра». З'езд раскрыў бяздонне паміж большэвікамі і меншавікамі, якое ўвесь час павялічвалася і прыняло да стварэння двух партый: большэвіцкай і меншавіцкай. Разнагалоссі, узнікшыя на II з'ездзе па арганізацыйных пытаннях паміж меншавікамі і большэвікамі, пасля з'езда яшчэ больш абвастрыліся. Меншавікі імкнуліся сарваць рашэнні з'езда і захваціць у свае рукі ўсе цэнтры партыі. Яны патрабавалі ўключэння сваіх прадстаўнікоў у рэдакцыю «Искры» і ў ЦК партыі, каб мець большасць у рэдакцыі і роўную з большэвікамі колькасць месц у ЦК партыі. Большэвікі адверглі прапанову меншавікоў, як парушаючую рашэнні II з'езда. Меншавікі пайшлі далей. Яны стварылі сваю фракцыйную арганізацыю пад кіраўніцтвам Мартава, Троцкага і Аксельрода, якая падняла паўстанне супроць ленінізма. Гэта раскольніцкая арганізацыя займалася дэзарганізацыяй партыйнай работы, тармажэннем усякай партыйнай справы. Цэнтрам меншавізма адкуль яны праводзілі абстрэл большэвікоў, з'яўлялася «Заграничная ліга» рускіх соцыял-дэмакратаў.

Значную дапамогу аказаў меншавікам пасля з'езда Плеханаў, які на з'ездзе ішоў разам з Леніным, а пасля з'езда пайшоў на прымірэнне з меншавікамі і, нарэшце, сам стаў меншавіком. Плеханаў высунуў трэбаванне аб уключэнні ў саставу рэдакцыі «Искры» старых рэдактараў-меншавікоў, якія былі адвергнуты з'ездам. Ленін не згадзіўся з такім трэбаваннем і выйшаў з саставу рэдакцыі «Искры», каб мацней замацаваць пазіцыі большэвікоў у ЦК партыі. Плеханаў, наперакор рашэнню з'езда, каптываў рэдактараў-меншавікоў у саставу рэдакцыі «Искры», якая, пачынаючы з 52 нумара, пачала ажыццяўляць апартуністычную палітыку меншавікоў.

Атрымаўшы ў свае рукі «Искру», меншавікі заняліся траўляй большэвікоў, адкрылі форменны паход супроць ленінізма. Меншавікі пачалі еднаць вакол сябе ўсе апартуністычныя плыні («эканамістаў», бундаўцаў) і павялі шалёныя атакі супроць партыі, як адзінага цэлага, прапаведвалі неабходнасць у партыі ўсякага роду фракцый, групіровак, абаранялі парадак «самазалічэння» ў партыю, выступалі супроць пролетарскай дысцыпліны і цэнтралізма ў партыі, прапаведвалі інтэлігенцкі індывідуалізм, апраўдвалі анархічную недысцыплінаванасць. Уся гэта палітыка меншавікоў была накіравана, у канчатковым рахунку, на ліквідацыю партыі, на разбурэнне пролетарыята перад тварам арганізаванага ворага рабочых і сялян.

***

У гэтых крайне цяжкіх для партыі ўмовах Ленін напісаў сваю работу «Крок уперад, два крокі назад». Такая назва кнігі адлюстроўвала сапраўдны змест барацьбы, якая адбывалася паміж большэвікамі і меншавікамі. Другі з'езд з'яўляўся крокам наперад па шляху стварэння партыі новага тыпу. Гэты крок каштаваў велізарных сіл, якія былі расходаваны большэвікамі для арганізацыі партыі. Меншавікі-ж пасля з'езда зрабілі два крокі назад, цягнулі да ліквідацыі партыі, да гуртко ўшчыны, да стыхійнасці і неарганізаванасці рабочага руху, у балота апартунізма.

У сваёй кнізе «Крок уперад, два крокі назад» Ленін выкрыў да канца арганізацыйны апартунізм меншавікоў, паказаў усё шкодніцтва гэтага апартунізма для партыі і рабочага класа і стварыў цэлую навуку аб партыі новага тыпу. Ленін ускрыў ва ўсім агіднейшым выглядзе апартунізм меншавікоў на матэрыялах II з'езда і паследуючых раскольніцкіх дзеянняў меншавікоў. Ленін паказаў у самым разгорнутым выглядзе ўсе апартуністычныя групіроўкі II з'езда, іх паводзіны, іх здрадніцтва інтарэсам рабочага класа. Ленін разбіў канчаткова ўсе довады меншавікоў, увесь іх апартунізм у арганізацыйных пытаннях і паказаў, якой павінна быць партыя і па якіх пачатках яна павінна будавацца.

Ленін, выкрываючы меншавізм, крок за крокам адстойваў арганізацыйныя прынцыпы большэвізма. «У чым-жа заключалася, — пісаў Ленін, — галоўная задача з'езда? У стварэнні **сапраўднай** партыі на тых прынцыповых і арганізацыйных пачатках, якія былі высунуты і распрацаваны «Искрой»... Іскраўская праграма і напрамак павінны былі стаць праграмай і напрамкам партыі, іскраўскія арганізацыйныя планы павінны былі атрымаць замацаванне ў арганізацыйным статуце партыі». (Т. VI, стар. 164).

Меншавікі адвяргалі самым рашучым чынам іскраўскі арганізацыйны план пабудовы партыі. Яны змагаліся супроць партыі, як перадавога, арганізаванага і дысцыплінаванага атрада рабочага класа. Змагаючыся супроць арганізацыйнай распушчанасці меншавікоў, Ленін даказаў, што партыя пролетарыята гэта—перадавы, свядомы марксісцкі атрад рабочага класа, які ўзброен веданнем законаў грамадскага развіцця, законаў класавай барацьбы, і таму здольна кіраваць класавай барацьбой пролетарыята супроць памешчыкаў і буржуазіі.

Ленін вучыў партыю і рабочы клас, што нельга змешваць партыю з рабочым класам, як нельга змешваць частку і цэлае, што нельга зніжаць узровень свядомасці партыі да ўзроўню «кожнага стачачніка», што неабходна сістэматычна ўзнімаць масы рабочага класа, свядомасць «кожнага стачачніка» да ўзроўню партыі. Ва ўмовах капіталізма, — гаварыў Ленін, — увесь клас не ў стане ўзняцца да ўзроўню свядомасці і актыўнасці перадавога атрада, сваёй партыі, што нават больш прымітыўная арганізацыя, як профсаюзы, не можа ахапіць усяго рабочага класа ва ўмовах капіталізма.

Але партыя рабочага класа, вучыў Ленін, з'яўляецца не толькі перадавым атрадам, але і арганізаваным атрадам рабочага класа. Таму кожны член партыі павінен састаяць у адной з яе арганізацый, падпарадкавацца рашэнням партыі. Партыя, гаварыў Ленін, можа мець адзіную волю, ажыццяўляць адзінства дзеянняў сваіх членаў, калі яна прадстаўляе з сябе адзіны арганізаваны атрад, спаяны адзінствам волі, адзінствам дзеянняў, адзінствам дысцыпліны. Іншае разуменне партыі было варожа духу вучэння марксізма-ленінізма аб партыі.

Меншавікі выступалі супроць партыі, як адзінага, арганізаванага цэлага, супроць пролетарскай дысцыпліны. Яны прабавалі ператварыць партыю ў прахадны двор, куды маглі ўвахо дзіць усе, каму ўздумаецца. Меншавікі шырока раскрывалі дзверы партыі для ўсякага роду часовых спадарожнікаў, для ўсякага роду прафесараў і гімназістаў, для ўсякага роду драбных і няўстойлівых элементаў, якія прэзіралі і баяліся, як чорт ладана, пролетарскай арганізацыі і дысцыпліны.

«Пролетарыят, — пісаў Ленін, — не баіцца арганізацыі і дысцыпліны... Не пролетарыяту, а **некаторым інтэлігентам** у нашай партыі нехапае **самавыхавання** ў духу арганізацыі і дысцыпліны». (Том VI, стар. 307).

І далей:

«Ніхто не адважыцца адмаўляць, што **інтэлігенцыя, як асобы слой** сучасных капіталістычных грамадстваў, характарызуецца, у агульным і цэлым, **іменна індывідуалізмам** і няздольнасцю да дысцыпліны і арганізацыі». (Там-жа, стар. 212).

Ленін далей паказаў, што партыя з'яўляецца не толькі перадавым, арганізаваным атрадам рабочага класа, але вышэйшай формай класавай арганізацыі пролетарыята. У рабочага класа, гаварыў Ленін, ёсць многа арганізацый. Кожная з іх адыгрывае пэўную ролю ў палітычным жыцці і барацьбе рабочага класа. Але партыя з'яўляецца вышэйшай формай класавай арганізацыі, таму што яна ўбірае ў сябе ўсё лепшае, усё перадавое, што ёсць у рабочым класе, дасканала вадае законамі развіцця грамадства, вопытам рэволюцыйнага руху і таму толькі яна мае права кіраваць усімі іншымі арганізацыямі рабочага класа.

Мала таго, палітычны напрамак у рабоце класавых арганізацый пролетарыята можа быць правільным, калі імі кіруе партыя рабочага класа. Меншавікі выключалі кіраўніцтва партыі класавымі арганізацыямі пролетарыята і тым самым разбройвалі пролетарыят, паслаблялі яго сілы ў барацьбе супроць буржуазіі.

Наша партыя стала найвялікшай сілай гістарычнага развіцця таму, што яна, з'яўляючыся перадавым, арганізаваным атрадам рабочага класа, вышэйшай формай класавай арганізацыі пролетарыята, мацавала сістэматычна свае сувязі з масамі і кіравала масамі. Партыя большэвікоў немінуча загінула-б, калі-б яна адарвалася ад мас, ад рабочага класа, ад сваёй жыццёвай базы. Але каб дабіцца давер'я мас, яна, партыя, павінна была весці правільную палітычную лінію, абараняць крОўныя інтарэсы працоўных.

Ленін абгрунтаваў у рабоце «Крок уперад, два крокі назад» неабходнасць арганізацыі партыі на пачатках цэнтралізма, які патрабуе адзінага статута, адзінай праграмы, адзінай дысцыпліны для ўсіх членаў партыі, адзінага кіруючага органа, падпарадкавання меншасці большасці, асобных арганізацый — цэнтру, нижэйшых арганізацый — вышэйшым. Раней, гаварыў Ленін, у нас не было партыі, як арганізаванага цэлага, партыя з'яўлялася толькі сумай прыватных груп і таму ўсе адносіны склаваліся на ідэйным узрэзенні. «**Цяпер** мы сталі арганізаванай партыяй, а гэта і азначае стварэнне ўлады, ператварэнне аўтарытэта ідэй у аўтарытэт улады, падначальванне партыйным вышэйшым інстанцыям з боку нижэйшых». (Там-жа, стар. 291). Ленін выкрыў да канца барскі анархізм меншавікоў, якія змагаліся супроць цэнтралізма ў партыі, якія разглядалі партыю з пэўнай дысцыплінай як фабрыку, як арганізацыю паняволення людзей і т. д. Меншавікі, змагаючыся супроць пролетарскай дысцыпліны, супроць цэнтралізма, звычайна заўлялі: «Мы не прыгонныя».

Крытыкуючы меншавікоў, Ленін пісаў: «Людзям, звыкшым да вольнага халату і туфляў сямейна-гуртковай абломаўшчыны, фармальны статут здаецца і вузкім, і песным, і абцяжарваючым, і нізменным, і бюракратычным, і прыгонніцкім, і сцясняльным для вольнага «працэсу» ідэйнай барацьбы. Барскі анархізм не разумее, што фармальны статут патрэбен іменна для замены вузкіх гуртковых сувязей шырокай партыйнай сувяззю». (Там-жа, стар. 310—311).

І далей:

«На меры таго, як складаецца ў нас *сапраўдная* партыя, свядомы рабочы павінен навучыцца адрозніваць псіхалогію воіна пролетарскай арміі ад псіхалогіі буржуазнага інтэлігента, які шчагаляе анархічнай фразай, павінен навучыцца **патрабаваць** выканання абавязкаў члена партыі не толькі ад радавых, але і ад «людзей верху...» (Там-жа, стар. 312).

Характарызуючы разнагалоссі ў партыі і ацэньваючы пазіцыю меншавікоў унутры партыі, як апартунізм у арганізацыйных пытаннях, Ленін лічыў, што галоўным грэхападзеннем меншавізма з'яўляецца іх недаацэнка значэння партыйнай арганізацыі, як неабходнай зброі для вызвалення пролетарыята.

Усе гэтыя арганізацыйныя палажэнні аб партыі пролетарыята, развітыя Леніным у яго кнізе «Крок уперад, два крокі назад», складаюць аснову ленінскага вучэння аб партыі. Ленін упершыню ў гісторыі марксізма стварыў стройнае, адзіна правільнае вучэнне аб партыі пролетарыята, як кіруючай, арганізуючай і накіроўваючай сіле ў барацьбе рабочага класа за ўладу, за соцыялізм. Ленін даказаў у сваёй кнізе «Крок уперад, два крокі назад», што пролетарыят не можа атрымаць перамогу над буржуазіяй, калі ён не будзе мець адзіную, згуртаваную, рэволюцыйную партыю. Кніга Леніна ўзброіла рабочы клас навукай аб партыі, навукай перамагаць сваіх ворагаў, навукай будаваць новае бясклассавае грамадства. З'яўленне ў свет кнігі Леніна садзейнічала хутчэйшаму згуртаванню мясцовых арганізацый вакол Леніна, перамозе ленінізма над меншавізмам.

***

Пасля смерці Леніна таварыш Сталін прадаўжаў развіваць далей вучэнне Леніна аб партыі. У сваіх лекцыях «Аб асновах ленінізма», чытаных у 1924 годзе, хутка пасля смерці Леніна, і прысвечаных ленінскаму прызыву ў партыю, таварыш Сталін па-майстэрску абгрунтаваў, развіў далей усе пытанні марксісцка-ленінскай тэорыі, у тым ліку і навуку аб партыі. Шэсць асаблівасцей пролетарскай партыі, ускрытых і развітых таварышам Сталіным у лекцыях «Аб асновах ленінізма», з'яўляюцца неацэнімым укладам у скарбніцу марксізма. У далейшых творах таварыша Сталіна шэсць асаблівасцей пролетарскай партыі атрымліваюць яшчэ больш глыбокае развіццё.

У «Кароткім курсе гісторыі ВКП(б)» ленінска-сталінскае вучэнне аб партыі выступае ў сваёй поўнай велічы і значэнні.

Партыя Леніна—Сталіна ператварылася ў магутную непераможную сілу, таму, што яна будавалася на цвёрдым, непарушным арганізацыйным фундаменце большэвізма, што яна высока трымала сцяг ленінска-сталінскай партыйнасці, што яна вяла адзіна правільную рэволюцыйную палітыку, што яна была цяснейшым чынам звязана з масамі, з народам.

Ленінска-сталінская партыя — гэта рашаючая сіла сусветнага развіцця. Партыя Леніна—Сталіна — узор для ўсіх комуністычных партый свету. Яна — увасабленне ўсіх светлых надзей, усіх благародных пачуццяў, усіх перадавых дзярэжанняў, якія рухаюць сусветную гісторыю, згуртоўваюць народы свету пад вялікім і ўсёперамагаючым сцягам марксісцка-ленінскай тэорыі.

Ф. КОШЭЛЕЎ.

Настаўнік Выдрынскай напоўнай сярэдняй школы (Чырвонапольскі раён, Магілеўская вобласці) Міхей Майсеевіч Азараў, узнагароджаны ордэнам Леніна, за годы сваёй педагагічнай дзейнасці падрыхтаваў нямала выдатных вучняў. Многія з іх працуюць зараз педагогамі. НА ЗДЫМКУ: тав. Азараў сярод сваіх былых вучняў — цяпер настаўнікаў сельскіх школ, узнагароджаных медалямі «За трудовую доблесть». Злева направа — М. М. Азараў, І. А. Ящутка і А. А. Цімашэнка.
Фото А. Н. Розельмана (Фотахроніка БЕЛТА).

ЗАВАЮЕМ ВЫСОКІ ЎРАДЖАЙ

Сяўбу сёлета мы правялі на 10 дзён раней, чым у мінулым годзе, прычым правялі яе на больш высокім агратэхнічным узроўні. Увесь яравы клін у 391 гектар пасеян сартавым насеннем па добра ўгноенаму зяблеваму ворыву. Асаблівая ўвага пры сяўбе ўдзелена насенным участкам. Пад насеннікі ў нас занята 37 гектараў. Усе яны засеяны на лепшых папярэдніках яравізаваным насеннем.

Паспяхова правёўшы веснавую сяўбу, мы ў брыгадах і звеннях дэтальна абмеркавалі план догляду за пасевамі. Усе 10 пастаянных звенняў прыступілі зараз да рэалізацыі намечаных планаў. Пасля дажджоў на яравых пасевах паявілася корка, якая пагражала прарастанню насення. Каб пазбегнуць гэтага, мы правялі лёгкае баранаванне пасеваў. На нізкіх месцах пракапалі канаўкі для стоку вады.

Вялікую ўвагу мы ўдзяляем праполцы і падкормцы. Яшчэ ў красавіку было падкормлена 30 гектараў азімага жыта. У кожным звяне для падкормкі пасеваў яравых падрыхтаваны ўгнаенні. Хутка прыступім да праполкі. На насенных участках правядзем не менш 3-х праполак: адну ад пустазелля і дзве сартавыя.

Няма сумнення, што паспяховае правядзенне сяўбы і ўзоры догляду за пасевамі забяспечаць нам высокі ўраджай усіх культур.

В. П. САКАВЕЦ,
старшыня калгаса «Май», Крупскага раёна.

ПАГРАНІЧНІКІ КІРУЮЦЬ АБАРОННАЙ РАБОТАЙ У КАЛГАСАХ

ЗАХОДНЯЯ ГРАНІЦА, БССР. У вольны ад заняткаў час байцы, камандзіры і палітработнікі пагранічнага атрада, дзе сакратаром партбюро тав. Байрачны, праводзяць у калгасах вялікую палітычна-масавую работу, кіруюць абароннымі гурткамі. Партарганізацыя атрада вылучыла 70 агітатараў для правядзення ў калгасах гутарак і чытак.

Абаронную работу ў калгасе «Чырвоны пуцілавец» узначальваюць слаўныя пагранічнікі падраздзялення тав. Гогалева. 26 калгаснікаў выцатна аўладалі стральбой з ручнога кулямёта, 10 калгаснікаў — гранатамятаннем.

У калгасе «На варце» абаронныя заняткі з калгаснікамі праводзіць камандзір аддзялення — комсамолец тав. Кавалёў. 6 мая ў калгасе адбылася трэніраваная стральба на адлегласць у 25 метраў. Лепшыя рэзультаты паказаў калгасны брыгадзір т. Пашын, які выбіў 24 ачкі з 25 магчымых. (БЕЛТА).

УДЗЕЛЬНІКІ УСЕСАЮЗНАЙ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ВЫСТАЎКІ *)

Пастанова Галоўнага Камітэта Ўсесаюзнай Сельскагаспадарчай Выстаўкі ад 20 красавіка 1939 г.

Зацвердзіць удзельнікамі Ўсесаюзнай Сельскагаспадарчай Выстаўкі, з занясеннем у Пачотную кнігу Усесаюзнай Сельскагаспадарчай Выстаўкі:

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР

(Працяг)

250. **Макарэвіч** Васілій Якаўлевіч, ст. конюх калгаса «XVII партз'езд», Горацкага раёна, Магілеўскай вобласці, які вырасціў у 1938 годзе ад 14 конематак 14 жарабят.

251. **Аўдзеенка** Іван Ефімавіч, конюх калгаса імені Бузённага, Чэрыкаўскага раёна, Магілеўскай вобласці, які вырасціў у 1938 годзе ад 13 конематак 13 жарабят.

252. **Андрэенка** Васілій Лаўрэнавіч, конюх калгаса імені Варашылава, Чэрыкаўскага раёна, які вырасціў у 1938 годзе ад 12 конематак 12 жарабят.

253. **Маскаленё** Даніл Васільевіч, конюх калгаса «Зара», Каспюковіцкага раёна, Магілеўскай вобласці, які атрымаў у 1938 годзе ад 12 конематак 12 жарабят.

254. **Баран** Свірыд Нікалаевіч, конюх калгаса «Пабядзіцель», Бярэзінскага раёна, Магілеўскай вобласці, які вырасціў у 1938 годзе ад 12 конематак 12 жарабят.

255. **Крайнеў** Сяргей Майсеевіч, старшы конюх калгаса «Чырвоная Паляна», Хопімскага раёна, Магілеўскай вобласці, які вырасціў у 1938 годзе ад 12 конематак 12 жарабят

256. **Ляўша** Павел Іванавіч, старшы конюх калгаса «12 год Кастрычніцкай рэволюцыі», Талачынскага раёна, Віцебскай вобласці, які вырасціў у 1938 годзе ад 10 конематак 10 жарабят.

257. **Шчэрба** Іван Фёдаравіч, конюх калгаса імені Калініна, Бабруйскага раёна, які вырасціў у 1938 годзе ад 10 конематак 10 жарабят.

258. **Шаўцоў** Іван Фёдаравіч, старшы конюх калгаса «Чырвоны баранцбіт», Бабруйскага раёна, які вырасціў у 1938 годзе ад 10 конематак 10 жарабят.

259. **Майсеенка** Іван Сілаевіч, старшы конюх калгаса «Совецкая Беларусь», Дрыбінскага раёна, Магілеўскай вобласці, які вырасціў у 1938 годзе ад 10 конематак 10 жарабят.

260. **Пратасеня** Нікалай Васільевіч, конюх калгаса імені Бузённага, Слуцкага раёна, Менскай вобласці, які вырасціў ад 10 конематак 10 жарабят.

261. **Цішкевіч** Людвіг Вікенцьевіч, конюх калгаса «Асоавіяхім», Хойніцкага раёна, Палескай вобласці, які вырасціў у 1938 годзе ад 8 конематак 8 жарабят.

262. **Марнусенка** Піхан Кірылавіч, старшы конюх калгаса «Ленінец», Прапойскага раёна, Магілеўскай вобласці, які вырасціў у 1938 годзе ад 8 конематак 8 жарабят.

263. **Баль** Іван Нікіціч, старшы конюх калгаса «Перамога соцыялізма», Хойніцкага раёна, Палескай вобласці, які вырасціў у 1938 годзе ад 8 конематак 8 жарабят.

264. **Жылач** Нікалай Нікалаевіч, конюх калгаса «Герой працы», Заслаўскага раёна, Менскай вобласці, які вырасціў у 1938 годзе ад 17 конематак 16 жарабят.

265. **Курцін** Владзімір Фаміч, старшы конюх калгаса «Адраджэнне», Горацкага раёна, Магілеўскай вобласці, які вырасціў у 1938 годзе ад 15 конематак 14 жарабят.

266. **Нікіцін** Гаўрыіл Сямёнавіч, конюх калгаса імені Варашылава, Горацкага раёна, які вырасціў у 1938 годзе ад 14 конематак 13 жарабят.

267. **Дзюндзін** Ілья Антонавіч, старшы конюх калгаса «Перамога», Каспюковіцкага раёна, Магілеўскай вобласці, які вырасціў у 1938 годзе ад 14 конематак 13 жарабят.

268. **Васільчанка** Андрэй Цімафеевіч, конюх калгаса «Зара», Каспюковіцкага раёна, які вырасціў у 1938 годзе ад 13 конематак 12 жарабят.

269. **Стальмакоў** Фама Іванавіч, старшы конюх калгаса імені ЦК ВКП(б), Клімавіцкага раёна, Магілеўскай вобласці, які вырасціў у 1938 годзе ад 13 конематак 12 жарабят.

270. **Клімянок** Максім Іванавіч, старшы конюх калгаса «Лепшая доля», Парыцкага раёна, Палескай вобласці, які вырасціў у 1938 годзе ад 13 конематак 12 жарабят.

271. **Магдалаў** Лазар Анісімавіч, конюх калгаса «Першае мая», Магілеўскага раёна, які вырасціў у 1938 годзе ад 12 конематак 11 жарабят.

272. **Шамецька** Антон Іванавіч, старшы конюх калгаса «Чырвоная зорка», Бярэзінскага раёна, Магілеўскай вобласці, які вырасціў у 1938 годзе ад 12 конематак 11 жарабят.

273. **Харытонаў** Сямён Кірылавіч, конюх калгаса «Пабеда», Клімавіцкага раёна, Магілеўскай вобласці, які вырасціў у 1938 годзе ад 11 конематак 10 жарабят.

274. **Рабцаў** Нікіфар Осіпавіч, старшы конюх калгаса імені СНК, Клімавіцкага раёна, які вырасціў у 1938 годзе ад 11 конематак 10 жарабят.

275. **Русый** Сямён Філіпавіч, конюх калгаса «Новае жыццё», Тураўскага раёна, Палескай вобласці, які вырасціў у 1938 годзе ад 11 конематак 10 жарабят.

276. **Блоцкі** Павел Ануфрыевіч, конюх калгаса «Чырвоны пуцілавец», Тураўскага раёна, які вырасціў у 1938 годзе ад 11 конематак 10 жарабят.

277. **Зюскін** Фама Андрэевіч, старшы конюх калгаса «Пролетарская свабода», Клімавіцкага раёна, Магілеўскай вобласці, які вырасціў у 1938 годзе ад 20 конематак 18 жарабят.

278. **Торчык** Нікіфар Якімавіч, старшы конюх калгаса «Совецкая Беларусь», Тураўскага раёна, Палескай вобласці, які вырасціў у 1938 годзе ад 10 конематак 9 жарабят.

279. **Міхейчык** Нікалай Дзмітрыевіч, старшы конюх калгаса «Комсамольская воля», Смалявіцкага раёна, Менскай вобласці, які вырасціў у 1938 годзе ад 10 конематак 9 жарабят.

280. **Пугачоў** Майсей Андрэевіч, старшы конюх калгаса «Молат», Ушацкага раёна, Віцебскай вобласці, які вырасціў у 1938 годзе ад 10 конематак 9 жарабят.

281. **Харошка** Платон Паўлавіч, конюх калгаса «Чырвоны бор», Хойніцкага раёна, Палескай вобласці, які вырасціў у 1938 годзе 16 жарабят, а ўсяго за 8 год работы па догляду за маладняком вырасціў ад ад'ёму да рабочага ўзросту 70 коней.

282. **Племянная свінагадоўчая ферма калгаса «Першае мая»**, Слуцкага раёна, Менскай вобласці, якая вырасціла племянных парасят у сярэднім за 1937—38 гг. ад 18 свінаматак па 17,4 дзелавых парасят.

283. **Малочна-таварная ферма калгаса «Першае мая»**, Слуцкага раёна, якая атрымала ў сярэднім за 1937—38 гг. па 1588,7 літра малака ад кожнай фуражнай каровы (у 1937 г.—124 каровы і ў 1938 годзе — 119 кароў).

284. **Мунасей** Файвель Абрамавіч, загадчык малочна-таварнай фермы калгаса «Першае мая», Слуцкага раёна.

285. **Свінатаварная ферма калгаса «Чырвоная Трасцяніца»**, Барысаўскага раёна, Менскай вобласці, якая атрымала ў сярэднім за 1937—38 гг. ад 12 свінаматак па 16 дзелавых парасят.

286. **Дашынскі** Васілій Пятровіч, заг. свінатаварнай фермы калгаса «Чырвоная Трасцяніца», Барысаўскага раёна.

(Працяг будзе).

*) Пачатак у №№ 103—111.

ПАВІЛЬЁН БЕЛАРУСІ НА ЎСЕСАЮЗНАЙ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ВЫСТАЎЦЫ

Павільён Беларускай ССР размешчан на Плошчы Калгасаў. Мастакі БССР шырока скарыстоўваюць у афармленні павільёна матывы беларускай народнай творчасці.

Каля ўваходу ў павільён — трохметравая скульптурная група — пагранічнік са службовым сабакам і дзяўчына-калгаспіца.

Гэтая група ўвасабляе згуртаванасць народа і арміі ў ахове свяшчэнных граніц сацыялістычнай радзімы.

Шэсць залаў павільёна ўсім сваім зместам пакажуць, што пад мудрым кіраўніцтвам партыі большэвікоў, пад вадзіцельствам вялікага Сталіна Беларусь з бяспраўнай, жорстка эксплаатуемай царызмам поўкалоніі ператворана ў квітнеючую індустрыяльна-калгасную рэспубліку.

Лепны герб СССР у аванзале і мастацкія барэльефы палкрэсліваюць, што Беларусь — неад'емная частка вялікага Совецкага Саюза, нязломны фарпост на яго заходніх рубяжах.

Цэнтральны зал павільёна прысвечан Канстытуцыі БССР, кіруючай ролі комуністычнай партыі ў стварэнні Беларускай Совецкай Сацыялістычнай Рэспублікі і рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Увагу наведвальніка прыцягне размешчаная ў цэнтры зала выдатная групавая скульптура — Ленін і Сталін.

Па цэнтральнай сцяне — герб БССР і ордэн Леніна, якім узнагароджана рэспубліка. Жывапісны фрыз азнаёміць наведвальнікаў з дзейнасцю бліжэйшых саратнікаў вялікага Сталіна — Л. М. Кагановіча, Фрунзе, Орджанікідзе ў БССР у перыяд Кастрычніка і грамадзянскай вайны. Другі фрыз паказвае свята беларускага народа, прысвечанае прыняццю Сталінскай Канстытуцыі. У кампазіцыі фрыза выдзяляецца фігура першага маршала Совецкага Саюза тав. Варашылава, дэпутата Вярхоўнага Совета СССР ад Беларусі.

Велізарны стэнд адведзен соцыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі рэспублікі. Гэта—яркі, захапляючы расказ аб поспехах соцыялістычнага земляробства.

Унізе стэнда, на экране, — серыя дакументальных і цыфравых матэрыялаў аб нядаўнім мінулым беларускага народа. Да рэволюцыі дзве трэці зямлі належалі памешчыкам, царкве і царскай фаміліі. 200 тысяч батракоў працавалі на панскіх і кулацкіх землях. Саха, барана, пасеўны кошык, ручны пэп — такою была «тэхніка» сялянскай гаспадаркі дарэволюцыйнай Беларусі.

Гэтай змрочнай мінуўшчыне процістаўляецца яркі і пераканаўчы расказ аб росквіце калгасаў Беларусі.

У рэспубліцы 9.665 калгасаў, за якімі замацавана навечна каля 8 мільёнаў гектараў зямлі. Іх абслугоўваюць 234 машынна-трактарныя станцыі. На соўгаснакалгасных палях працуюць каля 9.000 трактараў, каля паўтары тысячы камбайнаў, дзесяткі тысяч складаных сельскагаспадарчых машын.

У бакавых залах павільёна паказаны дасягненні перадавых калгасаў, соўгасаў, МТС, жывёлагадоўчых таварных ферм і перадавікоў сельскай гаспадаркі.

У спецыяльным зале паказаны поспехі ільнаводства. Лён — вядучая тэхнічная культура ў Беларусі. Плошча пасеву ільну павялічылася з 71,8 тыс. гектара ў 1913 годзе да 210 тыс. гектараў ў 1938 годзе. Таварная прадукцыя ільну павысілася ў 4 разы.

Адзін са стэндаў зала паказвае дасягненні калгаса «Брыгадзір», Аршанскага раёна. Высокая агратэхніка — правільны севаабарот, сяўба па канюшынішчу, прыменнене мінеральных угнаенняў — з года ў год павышае ўраджай ільну. У 1937 годзе калгас атрымаў па 5,7 цэнтнера ільнавалакна з гектара, а ў 1938 годзе — 7,6 цэнтнера.

Сярод лепшых звеннявых-ільнаводаў, вопыт якіх паказваецца ў зале, — дэпутат Вярхоўнага Совета БССР М. А. Саранчук з калгаса «Перамога», Рэчыцкага раёна. Яна сабрала ў 1938 годзе 13,97 цнт. семя селекцыйнага ільну з гектара.

Вялікія дасягненні рэспублікі ў расшырэнні пасеваў пшаніцы. За годы рэволюцыі пасевы пшаніцы павялічыліся ў 6 разоў.

Выразна і красачна пакажа павільён работы па асваенню і прамысловаму скарыстанню балот, якія займаюць чверць усіх плошчаў рэспублікі. Гэта, сапраўды, адна з бліскучых перамог соцыялістычнага земляробства Беларусі.

Да совецкай улады балоты зусім не асушваліся і не асвайваліся. Яны былі ачагамі хвароб, уносіўшых штогод тысячы жыццяў «палешукоў», гэтых забітых поўрабоў дарэволюцыйнага Палесся.

94 тыс. гектараў балот асушана пад палявыя культуры, 520 тыс. гектараў— пад сенажаці, 3.145 клм. магістральных каналаў і адрэгуліраваных рэк — вось вынікі г